**Метадычныя рэкамендацыі па вывучэнні фанетыкі і арфаграфіі беларускай мовы дзецьмі з парушэннем слыху**

Першасную ўвагу пры навучанні беларускай мове дзяцей з парушэннем слыху варта ўдзяліць фанетыцы (арфаэпіі) і арфаграфіі (правапісу), паколькі веданне гэтага матэрыялу будзе садзейнічаць далейшаму паспяховаму засваенню лінгвістычных правіл. Пры выкладанні дадзеных тэм трэба памятаць, што ў стандарце адукацыйнай вобласці “Беларуская мова” адзначаны толькі азнаямляльны характар з названымі тэмамі, з разлікам на што і павінна быць пабудавана праца настаўніка.

На ўроках беларускай мовы варта па магчымасці навучыць дзяцей чуць і правільна вымаўляць асобныя гукі і іх спалучэнні. У сувязі з поўнай ці частковай адсутнасцю гукавога кампаненту ў сенсорным вопыце дзяцей пазнанне асаблівасцей фанетыкі – складаны працэс. Дзеці з парушэннем слыху не могуць сфарміраваць дакладныя слыхавыя вобразы гукаў. Таму знаёмства з фанетыкай беларускай мовы ажыццяўляецца іншымі, чым у масавай адукацыйнай школе, шляхамі, з апорай на захаваныя аналізатары, а таксама з выкарыстаннем астатковай слыхавой функцыі.

Такая праца павінна праводзіцца на індывідуальных занятках, а на ўроках беларускай мовы толькі параўноўваюцца супадзенні або варыянты напісання і вымаўлення.

Уяўленне пра асаблівасці беларускай фанетыкі ў дзяцей з парушэннем слыху можна сфарміраваць праз сістэму назіранняў за дзейнасцю маўленча-рухальнага аналізатара і практыкаванняў у вымаўленні-чытанні з выкарыстаннем параўнальнага падыходу.

Належыць тут першасную ўвагу ўдзяліць вымаўленню спецыфічных беларускамоўных гукаў. Так, каб навучыць правільнаму вымаўленню гука [**дз’**] як звонкай пары глухога гука [**ц’**], зрокаваму ўспрыняццю дзяцей прапануюцца для параўнання пары тыпу *дзед – дед, дзень – день.* Вучні адзначаюць адрозненні ў напісанні слоў, настаўнік засяроджвае іх увагу на адсутнасць у беларускай мове мяккага гука [д’]. Практыкаванні ў вымаўленні [дз’] у складзе слова дазваляюць усвядоміць розніцу ў адчуваннях ад палажэння языка у момант вымаўлення [д] і [дз’]. Правільнае вымаўленне гука [дз’] можна сфарміраваць з дапамогай ручнога кантролю, з апорай на тактыльную адчувальнасць у момант надання голасу пры вымаўленні гука [ц’]. Аналагічным шляхам вучні з парушэннем слыху асвойваюць спецыфіку вымаўлення гукаў [т] - [ц’] (*цень – тень, дзеці – дети*).

Вымаўленне зацвярдзелага гука [**р**] для дзяцей з парушэннем слыху аналагічна вымаўленню гука [р’], і таму вымаўленне беларускамоўнага варыянта не патрабуе ад дзяцей дадатковых намаганняў.

Вымаўленне шчыліннага гука [**г**] дасягаецца праз тактыльнае адчуванне пры наданні звонкасці глухому гуку [х]. Такое вымаўленне дасягаецца ці

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

шляхам ручнога кантролю, ці праз слыхавое ўспрыняцце (калі дзеці слаба чуюць).

Вымаўленне гука [**дж**] дасягаецца традыцыйным шляхам: аналагічна вымаўленню гукаў [**д**] і [**ж**] ці ў практыкаваннях па наданні звонкасці голасу пры вымаўленні глухога парнага гука [**ч**]. Такі ж спосаб выкарыстоўваецца пры навучанні вымаўленню гукаў [**шч**].

Вымаўленне гука [**ў**] не патрабуе ад вучняў з парушэннем слыху асаблівых навыкаў і паспяхова засвойваецца дзецьмі зпарушэннем слыху.

Вывучэнне матэрыялу гэтай тэмы дае магчымасць вучням пазнаёміцца вучням з такімі тэмамі беларускай фанетыкі, як "Галосныя і зычныя гукі і літары", "Склад", "Мяккасць зычных і яе абазначэнне на пісьме", "Націск", "Націскныя і ненаціскныя галосныя", "Звонкія і глухія зычныя" і г.д. Вывучэнне ўсіх гэтых тэм абапіраецца на тыя ўменні і навыкі, якія дзеці атрымалі раней. Аднак па-ранейшаму асноўная задача вывучэння гэтага раздзела застаецца чыста практычнай – развіваць у вучняў правільнае і выразнае вымаўленне гукаў, слоў, уменне дзяліць словы на склады, выдзяляць у іх гукі і абазначаць іх на пісьме. Каб дзеці гэтаму, варта прымяняць такія агульныя пазнавальныя аперацыі, як аналіз, сінтэз, абстрагаванне, супрацьпастаўленне ў розных іх відах, а таксама практыкаванні тыпу:

- Вымавіць гукі ў словах *дзеці, цэлы, ціхі, серада, дажджы* і інш.;
- Вымавіць гукі, якія абазначаны літарамі, агульнымі для слоў *кот – кіт, мама –Міла, маці – цэмент* і інш.;
- Вымавіць спачатку галосныя, а затым зычныя гукі ў словах *Аліна, Маша, Коля, Сяргей* і інш.;
- Спісаць словы, падзяліць іх на склады, вызначыць націскны склад;
- Назваць літары, якімі абазначаны зычныя і галосныя гукі ў згаданых словах.

Параўнальны падыход выкарыстоўваецца таксама пры вывучэнні вучнямі з парушэннем слыху беларускага правапісу. Паколькі на ўсіх папярэдніх уроках праводзіўся гука-літарны аналіз слоў, пастаянна звярталася ўвага на называнне галосных і зычных гукаў і абазначэнне іх на пісьме, вучні ўжо павінны ўмець пісаць беларускамоўныя літары *І і, Дж дж, Дз дз, у* . Адрозніваючы цвёрдыя і мяккія зычныя гукі, дзеці павінны да гэтага часу засвоіць, што пасля мяккіх зычных пішуцца літары *е, ё, ю, я, і,* а таксама *ь* (мяккі знак). Таму вывучэнне арфаграфіі на дадзеным этапе зводзіцца да засваення наступных асноўных правіл:

- Правапіс галосных *о, э, у, а, ы* пасля зацвярдзелых *ж, ш, р, ч, дж,* а таксама пасля літар *д, т;*
- Правапіс *у–ў* (*ў* (у нескладовае) пішацца замест рускамоўных *л*: *поўнач\ полночь*; *в: паўтарэнне/повторение*; на канцы дзеясловаў прошлага часу адзіночнага ліку мужчынскага роду: *пісаў/писал* і інш. ).
- Правапіс *д – дз, т – ц;*
- Правапіс *о,э- а; е, ё – я*;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Правапіс *падоўжаных зычных;*
- Правапіс *мяккага знака (змякчальнага і раздзяляльнага)* і *апострафа;*
- Правапіс звонкіх зычных на канцы слоў (*дуб, грыб*) і ў сярэдзіне слоў перад глухімі зычнымі (*казка, сцежка*).

Пачатак рашэння задачы выпрацоўкі правільнага арфаграфічнага рэжыму закладваецца ўжо пры вывучэнні фанетыкі: каб правільна пісаць слова, трэба перш за ўсё яго правільна вымаўляць, а затым параўноўваць вымаўленне і напісанне з рускамоўным варыянтам і запамінаць. Тут патрэбна трэніроўка ў слуханні (наколькі гэта магчыма), вымаўленні і ў пісьме.

Аналагічным, параўнальным, шляхам вывучаюцца разыходжанні ў правапісе канчаткаў прыметнікаў і дзеясловаў: добры – добрый, добрае – доброе, добрыя – добрые; сіні - синий, сіняе – синее, сінія – синие. Чытае – читает, чытаюць - читают, піша – пишет, пішуць – пишут, сядзіць – сидит, сідзяць –сидят, ляжыць - лежит, ляжаць – лежат.

Шляхам запамінання дасягаецца веданне вучнямі арфаграм у такіх словах, як мухі (мухе), руцэ (руке), кнізе (книге), аб чалавеку (о человеке), старастам (старостой), ветру (ветра), на беразе (на берегу) і інш.

Важна адзначыць, што запамінанне – пастаянны клопат будучага настаўніка беларускай мовы ў спецыяльнай агульнаадукацыйнай школе для дзяцей з парушэннем слыху.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ